*Паважаны Аляксандр Генадзевіч!*
*Дарагія сябры!*

*Кіраўніцтва і калектыў Дзяржаўнай навуковай установы «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» шчыра і сардэчна віншуюць Вас з 85-годдзем з дня заснавання гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта!*

*85 год назад адбылася знамянальная падзея ў грамадскім жыцці Беларусі – быў створаны гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Ваша установа з'яўляецца найбуйнейшай у Рэспубліцы Беларусь адукацыйна-навуковым цэнтрам і карыстаецца шырокай міжнароднай вядомасцю і прызнаннем. За гады свайго існавання і дзейнасці гістарычны факультэт прайшоў складаны шлях фарміравання і стаў высокаарганізаванай установай, якая заняла асаблівае, выключнае па значэнні месца ў адукацыйнай і навуковай сістэме.*

*За 85 гадоў дзейнасці факультэт шмат зрабіў для ўмацавання аўтарытэту вучонага-гуманітарыя. Калектыў факультэта ўносіць значны ўклад у развіццё беларускай гістарычнай адукацыі і навукі. Нельга не адзначыць і плённую працу супрацоўнікаў факультэта па падрыхтоўцы высокапрафесійных спецыялістаў, папулярызацыі гісторыі Беларусі праз сродкі масавай інфармацыі, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці краіны.*

*Дарагія сябры! У дзень Вашага слаўнага 85-годдзя шчыра жадаем Вам добрага здароўя, шчасця, дабрабыту, багатага плёну ў творчай працы на карысць нашай Беларусі!*

*Дырэктар Інстытута*
*гісторыі НАН Беларусі* *В.В. Даніловіч*

*22 кастрычніка 2019 г.*